ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

КАСТРЫЧНІК

Віцебск 2013

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Кастрычнік

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск А. І. Сёмкін

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Кастрычнік

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК

2013

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : кастрычнік : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2013. – 32 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2013

МАТЭРЫЯЛЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК

Другі год у рамках Міжнароднага фестывалю сучаснай музыкі «Варшавская осень», які адбыўся ў канцы верасня, праходзяць канцэрты беларускай музыкі. Упершыню на гэтым форуме дзякуючы садзейнічанню Польскага інстытута ў Мінску была прадстаўлена не толькі музычная культура сталіцы Беларусі, але і культура рэгіёнаў. Першым у прастору фестывалю трапіў Віцебскі рэгіён, яго прадстаўляла абласная філармонія.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. –19 окт. – С. 5.

К. Мікалаева, народны артыст Беларусі *І. Алоўнікаў*.

Витебские вести. – 2013. – 22 окт. – С. 7.

Па выніках пятага абласнога агляду-конкурсу аркестраў школ мастацтваў Віцебшчыны калектыў аркестра народных інструментаў Чашніцкай дзіцячай школы мастацтваў рэкамендаваны да прысваення звання народнага.

Витебские вести. – 2013. – 19 окт. – С. 13.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

4 кастрычніка 88-ы тэатральны сезон у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа распачаўся традыцыйна – трохактавай камедыяй “Несцерка” В. Вольскага.

5 кастрычніка ў тэатральнай гасцёўні адбыўся творчы вечар *Лявона Агулянскага*. У праграме: прэзентацыя твораў пісьменніка, расказ пра супрацоўніцтва з тэатрамі Ізраіля і Беларусі і інш. Перад сустрэчай у вялікай зале Коласаўскага тэатра адбыўся паказ “, пастаўленай В. Анісенкам па п’се Л. Агулянскага.

8 кастрычніка ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа прайшоў бенефіс заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь *Таццяны Ліхачовай*.

28 кастрычніка на сцэне тэатра імя Якуба Коласа адбыўся канцэрт катернага аркестра і хору Дзяржаўнай установы «Гродзенская капэла». Госці прадставілі «Страсці па Матфею».

http://kolastheatre.by/be/novosti

Беларускі тэатр «Лялька» прымаў удзел у XVI Міжнародным фестывалі тэатраў лялек «Катавіцы для дзяцей». Фестываль праходзіў з **16** па **20 кастрычніка** ў г. Катавіцы (Польшча). Тэатр прадставіў спектакль для дзяцей на беларускай мове «Чароўная зброя Кэндзо».

27 кастрычніка адбыўся бенефіс артыста Беларускага тэатра «Лялька», вядучага майстра сцэны *Алеся Маханькова*.

http://lialka.by/bel/news/

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА…….4

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……..5

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 кастрычніка 2013 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, аддзелам культуры Міёрскага райвыканкама, РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Лепельскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Полацкай, Ушацкай, Шаркаўшчынскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.

КІНАМАСТАЦТВА

У **кастрычніку** ў Доме кіно адбылася прэм'ера гістарычнай карціны рэжысёра Ф. Бандарчука «Сталинград». Удзел у здымках блокбастара прымалі і члены групы ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Товарищи по оружию» з г. Віцебска.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 19 окт. – С. 16.

МУЗЫКА

З **18** па **20 кастрычніка** ў Віцебску праходзіў **фестываль-свята аўтарскай песні "Віцебскі лістапад"**. Галоўная інтрыга фестывалю – конкурс аўтарскай песні, у якім прынялі ўдзел больш за 30 выканаўцаў. А раскрылася яна на фінальным гала-канцэрце «Музычны праспект», калі былі названы імёны пераможцаў. Дыплома III ступені ўдастоены *Я. Шачанкова* з г. Ярцава (Смаленская вобласць) і *А. Мельнік* з г. Масквы. "Серабро" дасталося бардам з Беларусі – *В. Кузьмічу* (г. Мінск) і *В. Салыгу* (г. Орша). Дыплом I ступені атрымала маладая група з Віцебска "Minimum Distancii".

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 22 окт. – С. 3.

18 кастрычніка ў абласной філармоніі ўпершыню выступіў з сольнай праграмай "От барокко до романтизма" скрыпач-віртуоз *Уладзіслаў Міцэнка*.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 17 окт. – С. III.

14 кастрычніка на сцэне канцэртнай залы "Віцебск" адбыўся канцэрт-прысвячэнне легендарнаму спеваку М. Магамаева "Любоў мая – мелодыя". У канцэрце прымалі ўдзел вядучыя салісты лепшых оперных тэатраў свету *Давід Гвініадзе, Юрый Зальцман* і *Сяргей Плюснін*.

19–20 кастрычніка на Пастаўшчыне адбыўся **фестываль "Гучаць старажытныя арганы"**. Канцэртнымі пляцоўкамі выступілі касцёлы Св. Антонія ў раённым цэнтры, Св. Тадэвуша ў в. Лучаі, Св. Яна Хрысціцеля ў в. Камаі і Св. Андрэя ў г. п. Лынтупы. Класічныя творы выконвалі салісты Белдзяржфілармоніі *К. Шараў* і канцэртнай залы "Сафійскі сабор" *К. Пагарэлая*, выкладчыца Мінскага каледжа мастацтваў

Цэнтр сучаснага мастацтва прадставіў выстаўку работ творчага аб'яднання "Корень квадратный". У экспазіцыі дэманструюцца карціны *А. Слепава, А. Жыгура, Н. Ярмолавай*.

Витебский проспект. – 2013. – 31 окт. – С. 19.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

З **5** па **31 кастрычніка** ў Талачынскім Доме рамёстваў працавала выстаўка работ майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Кветкі раю".

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

З **7** па **11 кастрычніка** ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры прайшлі абласныя курсы "Роспіс па шкле".

Віцебскі АМЦНТ

З **8** па **31 кастрычніка** ў Талачынскім гісторыка-краязнаўчым музеі працавала выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Теряем" членаў народнага клуба народных майстроў і мастакоў-аматараў раённага Дома рамёстваў *Д. Іўчанка* і *Ю. Палякова*.

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

З **22 кастрычніка** ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці адкрыта для прагляду выстаўка твораў народнага мастацтва з фондаў АМЦНТ "Цяпло майстэрскіх рук".

Віцебскі АМЦНТ

31 кастрычніка ў Талачынскім раённым Доме рамёстваў прайшоў мастар-клас па напрамках дзейнасці ўстановы.

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

У Полацкім раённым Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур адкрылася выстаўка работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (лапікавае шыццё) мінскага майстра *Маргарыты Котавай*.

Полацкі веснік. – 2013. – 8 кастр. – С. 7.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра «Лялька» заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь *Віктар Клімчук* быў уганараваны Падзякай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За значны ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай культурнай палітыкі, плённую працу і высокае прафесійнае майстэрства". Цырымонія ўзнагароджання адбылася **11 кастрычніка** ў Мінску на ўрачыстым пасяджэнні Міністэрства культуры ў гонар Дня работнікаў культуры.

http://lialka.by/bel/news/

9 кастрычніка ў Віцебскай абласной філармоніі адбыліся ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню работнікаў культуры, і галоўная падзея – ўзнагароджанне лаўрэатаў прэміі Віцебскага аблвыканкама, якая прысуджаецца штогод за дасягненні ў галіне культуры і мастацтва.

Ганаровай граматай Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ўзнагароджаны: *Навіцкая Валянціна Георгіеўна*, намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шумілінскага раённага выканаўчага камітэта, кіраўнік народнага клуба аматараў беларускай нацыянальнай кухні "Разынка", *Кліменка Міхаіл Рыгоравіч*, дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі "Дзіцячая мастацкая школа г. Віцебска", за шматгадовую добрасумленную работу, значны асабісты ўклад у развіццё культуры і мастацтва вобласці.

Падзяка старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта аб'яўлена *народнаму квартэту "Натхненне"* выкладчыкаў дзяржаўнай установы адукацыі "Ушацкая дзіцячая школа мастацтваў", *ансамблю*

барабаншчыц “*Віват*” Глыбоцкага гарадскога Дома культуры, заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь *ансамблю песні імузыкі* “*Крыніца*” Дубровенскага раённага Дома культуры, *калектыву Аршанскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, калектыву Наваполацкага цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры* за значны асабісты ўклад у развіццё культуры і мастацтва вобласці.

Витебские вести. – 2013. – 17 окт. – С. 3.

Ганаровай граматай упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама ўзнагароджаны:

за актыўную работу па эстэтычным выхаванні дзяцей і моладзі, прапаганду музычнага мастацтва:

Гарабец Святлана Анатольеўна, настаўніца па класе баяна дзяржаўнай установы адукацыі ”Докшыцкая дзіцячая школа мастацтваў“;

– за актыўную работу па адраджэнні і прапагандзе народных рамёстваў:

Пятровіч Наталля Мікалаеўна, метадыст-майстр Докшыцкага Дома рамёстваў;

– за актыўную работу па развіцці пазабюджэтнай дзейнасці:

Ігнацкі Міхаіл Пятровіч, дырэктар Бярозаўскага сельскага Дома культуры;

– за актыўную работу і інавацыі па арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання:

Гудзь Алена Уладзіміраўна, загадчык філіяла Докшыцкай дзіцячай раённай бібліятэкі;

– за актыўную работу па развіцці мастацкай творчасці:

калектыў Прудніцкага сельскага Дома культуры (дырэктар *Сідзіна Вольга Анатольеўна*);

– за ўклад у развіццё традыцыйнай культуры, бібліятэчнай справы:

Мазго Галіна Мікалаеўна, загадчык аддзела камплектавання сеткі бібліятэк Лепельскага раёна;

Барыса Няпомняшчага. Другая – пад назвай “Знакомство с коллекцией. Портрет в России XIX – начала XX века” прадстаўляе 27 твораў партрэтнага жанру з фонду жывапісу Наўгародскага дзяржаўнага аб’яднанага музея-запаведніка.

Витебские вести. – 2013. – 15 окт. – С. 5.

У абласным цэнтры з’явілася новая славутасць – драўляная скульптура пажарных. Знаходзіцца яна каля аварыйна-выратавальнай часці Першамайскага раёна г. Віцебска (вул. Горкага, д. 44).

Витебские вести. – 2013. – 15 окт. – С. 8.

МАСТАЦТВА

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

8 кастрычніка ў абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстаўка работ мастакоў віцебскай мастацкай школы, а таксама прадстаўнікоў супрэматычнага накірунку з г. Мінска, прысвечаная 100-годдзю “Черного квадрата” Казіміра Малевіча.

У Арт-цэнтры Марка Шагала працуе выстаўка работ Роберта Геніна “В поисках утраченного рая…” (пастэль) з прыватнага збору *Аляксея* і *Ірыны Радзівонавых* (г. Санкт-Пецярбург). У фонд Музея Марка Шагала А. Радзівонаў перадаў гравюру Р. Геніна “Плачущая” (1923 г.) і кнігу “Наброски и воспоминания”.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 22 окт. – С. 7.

У выставачнай зале Цэнтра сучаснага мастацтва ў рамках творчага праекта “Родня” *Валянціны Ляховіч* прадстаўлена аднайменная выстаўка. Таксама ў экспазіцыі прадстаўлена творчасць дачкі і ўнукаў мастачкі.

Витебские вести. – 2013. – 7 окт. – С. 7.

Выстаўка работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва *Наталлі Лісоўскай* “Древо жизни” адкрылася ў Мастацкім музеі ў кастрычніку. Экспазіцыя габеленаў прысвечана юбілею майстра.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 17 окт. – С. 2.

Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк

Да Дня пажылых людзей у бібліятэках сістэмы адбыліся візіты дабрыні для людзей сталага ўзросту.

Супрацоўнікі *Васюкоўскай сельскай* і *Жукоўшчынскай сельскай* бібліятэк да Дня маці правялі літаратурна-музычны вечар “Свет материнства – свет любви”.

24 кастрычніка Выстаўка-прэзентацыя работ навучэнцаў дзіцячай школы мастацтваў “Чароўны свет фарбаў”, з удзелам мастака-акварэліста *А. Шыёнка* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

У абласным краязнаўчым музеі **17–18 кастрычніка** адбылася пятая навуковая канферэнцыя «Витебские древности», прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння гісторыка, краязнаўцы, педагога, члена Віцебскай вучонай архіўнай камісіі Уладзіміра Краснянскага (1863–1930 гг.). Гэта сумесны праект краязнаўчага музея і ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама. З дакладамі і паведамленнямі на канферэнцыі выступалі навукоўцы з г. Віцебска, г. Мінска, г. Полацка, г. Быхава, а таксама госці з Латвіі. У час выступленняў былі агучаны новыя здабыткі ў галіне археалогіі, гісторыі, краязнаўства.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 25 окт. – С. V.

У Глыбоцкім гісторыка-краязнаўчым музеі адкрылася выстаўка «Дзівосны свет дзядзькі Язэпа», прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння славутага земляка Я. Драздовіча (карціны, работы па дрэве).

Витебские вести. – 2013. – 24 окт. – С. 21.

З **22** па **27 кастрычніка** ў Браслаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя яго 25-годдзю.

Витебские вести. – 2013. – 12 окт. – С. 14.

У выставачных залах мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка адкрыліся дзве экспазіцыі з г. Ноўгарада (Расія). Адна з выставак уключае афорты і малюнкі мастака

Шастала Святлана Міхайлаўна, кіраўнік харэаграфічнага калектыву ”Затея“ ўстановы адукацыі ”Лепельская дзіцячая школа мастацтваў“;

Пракаповіч Алена Уладзіміраўна, кіраўнік народнага хору ”Бярэзіначка“ Домжарыцкага сельскага Дома культуры;

Міхно Аляксандр Пятровіч, настаўнік па класе баяна дзяржаўнай установы адукацыі ”Лепельская дзіцячая школа мастацтваў“, кіраўнік вакальнай групы ”Веселица“ Поўсвіжскага сельскага Дома культуры;

– за асабісты ўклад у падрыхтоўку і правядзенне культурна-грамадскіх мерапрыемстваў:

Куляшова Таццяна Вячаславаўна, загадчык пастановачнай часткі дзяржаўнай установы ”Цэнтр культуры ”Віцебск“;

– за высокае прафесійнае майстэрства, эстэтычнае выхаванне падрастаючага пакалення:

Драке Уладзіслаў Вадзімавіч, кіраўнік заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танца ”Лявоніха“;

– за добрасумленную шматгадовую работу ў галіне культуры:

Краўчанка Алена Аляксандраўна, інспектар па кадрах дзяржаўнай установы ”Цэнтр культуры ”Віцебск“;

Корсак Наталля Мікалаеўна, касір ўстановы адукацыі ”Наваполацкі дзяржаўны каледж“;

– за шматгадовую плённую працу па прапагандзе кнігі, высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі, значны ўклад у выхаваўчую работу з моладдзю:

Мацеша Галіна Андрэеўна, загадчык Браслаўскай дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 1 Браслаўскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы;

– за шматгадовую плённую працу па эстэтычным выхаванні навучэнцаў:

Бялусь Ірыну Аляксандраўну, настаўніка па класе баяна, кіраўніка ўзорнага аркестра баянаў дзяржаўнай установы адукацыі ”Браслаўская дзіцячая школа мастацтваў“;

– за шматгадовую плённую працу па прапагндзе харавога мастацтва, высокі ўзровень прафесійнага майстэрства калектыву:

Шыркевіч Марына Сямёнаўна, хармайстар народнага ансамбля песні ”На падворку“ Браслаўскага раённага Дома культуры;

– за шматгадовую добрасумленную працу па бібліятэчным абслугоўванні жыхароў горада:

Жыгалава Галіна Васільеўна, галоўны бібліятэкара бібліятэкі-філіяла № 16 Віцебскай гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы;

– за шматгадовую добрасумленную працу па развіцці міжнародных культурных сувязей:

Сальнікава Антаніна Васільеўна, начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва дзяржаўнай установы ”Цэнтр культуры ”Віцебск“;

– за асабісты ўклад у правядзенне рамонтна-будаўнічых работ і ўдасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры горада Віцебска:

Мядзвецкі Анатолій Іосіфавіч, намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта;

– за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва:

Маханькоў Аляксандр Леанідавіч, артыст, вядучы майстар сцэны тэатральна-відовішчнай установы ”Беларускі тэатр ”Лялька“;

– за шматгадовую плённую работу ў галіне культуры, высокі прафесіяналізм, асабісты ўклад у справу музеязнаўства і ахову гісторыка-культурнай спадчыны:

Акуневіч Вольга Іванаўна, загадчык філіяла ”Мастацкі музей“ установы культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“;

– за шматгадовую добрасумленную працу ў галіне культуры, высокі прафесіяналізм, асабісты ўклад у справу музеязнаўства, прапаганду гісторыка-культурных каштоўнасцей і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці:

Ісачанка Аксана Леанідаўна, старшы навуковы супрацоўнік ўстановы культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“;

Ф. Скарыны).

25 кастрычніка Вечар-партрэт “Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць” (*дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога*).

26 кастрычніка Віртуальнае падарожжа ў Малдову з праглядам відэафільмаў “Цірасполь” і “Малдова турыстычная” (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк

Да Дня пажылых людзей у бібліятэках сеткі прайшлі наступныя мерапрыемствы: вечар-партрэт “Когда мы вместе – жизнь светлей” (*Багданаўская сельская бібліятэка*), сустрэча на даму “Тепло души и сердца сохранить” (*Студёнкаўская сельская бібліятэка*), круглы стол “З павагай да Вас і любоўю” (*Рулёўшчынская сельская бібліятэка*), літаратурна-музычная кампазіцыя “Дорогие мои старики” (*Нямойтаўская сельская бібліятэка*) і інш.

Да Дня маці ў *Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэцы* прайшла літаратурная гадзіна “З гонарам пра маці”, у *раённай дзіцячай бібліятэцы* – літаратурны ранішнік “Мамы разные нужны, мамы всякие важны”, літаратурна-музычныя кампазіцыі “Ты одна такая – любімая і родная” (*Багушэўская гарпасялковая бібліятэка)*, “Гимн матери” (*Канстантоўская сельская бібліятэка*), “Жанчыны – Маці” (*Багданаўская сельская бібліятэка*).

Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк

1 кастрычніка Рэтра-вечар «Песни молодости нашей», прысвечаны Міжнароднаму дню пажылых людзей (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Е. Лось*).

11 кастрычніка Літаратурны вечар «У вершах жыць і гумарыць», прысвечаны паэту-земляку М. Мірановічу (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Е. Лось, раённы Дом культуры*).

Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк

10 кастрычніка *Цэнтральная раённая бібліятэка* на свяце ў гонар 70-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у рамках праекта “Бібліятэка па-за сценамі” запрасіла наведаць “Франтавую бібліятэку”. Экспазіцыя размясцілася ў фае раённага Дома культуры. Госці маглі азнаёміцца з кніжнай выстаўкай “Жыві і помні” і прыняць удзел у краязнаўчай віктарыне “Вызваленая Лёзненшчына”. Для наведвальнікаў была арганізавана рэклама кніг, напісаных удзельнікамі вызвалення гарадскога пасёлка.

24 кастрычніка Сустрэча з дзіцячым пісьменнікам *В. Т. Квілорыя* (*дзіцячая бібліятэка*).

Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк

1 кастрычніка Віншаванне ветэранаў бібліятэчнай справы з Днём пажылых людзей “Славим мудрость и молодость души” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

16 кастрычніка Семінар бібліятэчных работнікаў раёна “Бібліятэка – цэнтр экалагічнага выхавання і адукацыі насельніцтва” на базе *Ляхаўшчынскай сельскай бібліятэкі*.

Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк

1 кастрычніка Гульнёвая праграма “Бабулі і ўнукі” (*Вароніцкая сельская бібліятэка, сельскі клуб*).

1 кастрычніка Вечар адпачынку “Для тех, кто годы не считает”(*Бабыніцкая сельская бібліятэка-клуб*).

17 кастрычніка Літаратурны ранішнік “Мама – первое слово в каждой судьбе” (*дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога*).

19 кастрычніка Вечар-успамін “Летапіс бібліятэкі” (*Зялёнкаўская сельская бібліятэка, СДК*).

24 кастрычніка Дзелавая гульня “На вяршыні поспеха” для вучняў 11-га класа СШ № 2 (*цэнтральная раённая бібліятэка імя*

– за шматгадовую добрасумленную працу ў галіне культуры, высокі прафесіяналізм, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці:

Якімава Алена Уладзіміраўна, інспектар па кадрах установы культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“;

– за высокі прафесіяналізм, эстэтычнае выхаванне дзяцей і падлеткаў:

Балабуева Жанна Уладзіміраўна, дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі ”Глыбоцкая дзіцячая мастацкая школа імя Язэпа Драздовіча“;

– за плённую работу па захаванні і развіцці традыцыйных народных рамёстваў:

Дудкевіч Віктар Баляслававіч, метадыст разьбы па дрэве Глыбоцкага Дома рамёстваў;

– за асабісты ўклад у развіццё бібліятэчнай справы ў Глыбоцкім раёне:

Спасібёнак Валянціна Цімафееўна, дырэктар Глыбоцкай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы;

– за асабісты ўклад у развіццё культуры Глыбоцкага раёна:

Спяцанаву Тамара Уладзіміраўна, дырэктар Падсвільскага гарпасялковага Дома культуры.

З верасня 2013 года па жнівень 2014-га ў краіне проводзіцца **рэспубліканская грамадаска-культурная акцыя «Дорогами освободителей»**, прысвечаная 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Урачыстыя і памятныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да гэтай знамянальнай падзеі, пройдуць ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі і будуць храналагічна паўтораць шлях савецкіх воінаў-вызваліцеляў. Аднымі з першых у акцыю ўключыліся Лёзненскі і Дубровенскі раёны Віцебшчыны. **8 кастрычніка** ў Лёзненскім раёне каля в. Рублёва-2 быў адкрыты мемарыяльны знак у памяць пра байцоў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў 1941-м і 1943–1944 гадах. **9 кастрычніка** адбылося адкрыццё экскурсійнага маршрута «Кольцо памяти и славы», які праходзіць праз куткі раёна, звязаныя з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны.

У прыватнасці, адбылося адкрыццё пасля рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу “Тихмянская высота”. **26 кастрычніка** ў г. п. Сураж прайшоў мітынг на цэнтральным мемарыяльным комплексе, касцюміраванае ваеннае прадстаўленне, прэзентацыя бібліяграфічнага паказальніка “И помнит мир спасенный…”, тэматычная раённая выстаўка “70 гадоў вызвалення Беларусі”, экспазіцыя фотаработ, спартыўныя спаборніцтвы, канцэрты, салют.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 10 окт. – С. 2.

Витебские вести. – 2013. – 29 окт. – С. 1–2.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

Народны ансамбль народнай песні і музыкі “Вераснянка” Мазалаўскага сельскага Дома культуры прадставіў Віцебскі рэгіён на IX адкрытым абласным фальклорным фестывалі імя выканаўцы народных песень Вольгі Сяргеевай у горадзе Усвяты (Пскоўская вобласць).

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 17 окт. – С. V.

Віцебск з дзелавым візітам наведаў надзвычайны і Паўнамоцны пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь *Вальфрам Маас*. Мэты паездкі – знаёмства з эканамічным, адукацыйным і культурным патэнцыялам вобласці

Витебские вести. – 2013. – 26 окт. – С. 1.

АГРАЭКАТУРЫЗМ

17 кастрычніка ў г. Полацку прайшоў турыстычны семінар, на якім адбылося ўзнагароджанне лаўрэатаў і пераможцаў конкурсу “Лучшая агроэкоусадьба 2012 года Витебской области”. У лідарах *В. Паповіч* (“Чистые ключи”, Віцебскі р-н), *А. Шуневіч* (“Бяседы”, Лепельскі р-н), *Г. Саковіч* (“Славяночка”, Наваполацк), *Н. Ніканава* (“У Нинель”, Лёзненскі р-н) і *А. Казлоўская* (“Розета”, Браслаўскі р-н).

Витебские вести. – 2013. – 19 окт. – С. 1, 6.

У рамках Кангрэсу ініцыятыў Усходняй Еўропы падведзены вынікі Міжнароднага конкурсу на лепшы праект трансгранічнага

фарміравання грамадзянскай культуры насельніцтва” (*Езярышчынская гарпасялковая бібліятэка*).

Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк

2 кастрычніка Вечар-ушанаванне да Міжнароднага дня пажылых людзей “Вальс лістапада” (*Горская сельская бібліятэка*).

13 кастрычніка да Дня маці ў бібліятэках раёна прайшлі наступныя мерапрыемствы: шоу-праграма “Как ёмко, как прекрасно слово «Мама!»” (*Бароўская сельская бібліятэка, Цэнтр культуры і адпачынку*), літаратурна-музычная кампазіцыя “Будем вечно прославлять ту женщину, чьё имя – Мать” (*Грыгаравіцкая сельская бібліятэка-клуб*), вечар-прысвячэнне “Адзіная на свеце” (*Каменская сельская бібліятэка-музей Т. Кляшторнага*), музычна-паэтычны вечар “Моя мама – моя радость” (*Стайская сельская бібліятэка*) і інш.

14 кастрычніка Лтаратурна-гульнёвая праграма “Моя мама – лучшая на свете” (*дзіцячая бібліятэка*).

17 кастрычніка Адкрыццё выстаўкі работ юных мастакоў з аб’яднання “Яркие краски” Цэнтра дзяцей і моладзі г. Лепеля “В каждой работе частичка души” ў галерэі “Арт-Лепель” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

18 кастрычніка Вечар творчасці інвалідаў па зроку “З шырока заплюшчанымі вачыма” ў рамках месячніка “Чалавек з белым кіем” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

25 кастрычніка Тэматычны семінар для сельскіх бібліятэкараў “Беларуская літаратура – крыніца духоўнасці: дзейнасць бібліятэк сеткі па далучэнні чытачоў да лепшых узораў беларускай літаратуры” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

26 кастрычніка Гадзіна беражлівасці “Береги, экономь, умножай” (*Чарэйшчынская сельская бібліятэка-музей*).

матуля, у ногі пакланіцца” (*Лявонішанская сельская бібліятэка*).

21 кастрычніка Мультымедыйная прэзентацыя ў рамках месячніка “Белая трость” (*цэнтральная раённая бібліятэка*), прысвечаная паэтам, інвалідам па зроку, на якой прысутнічалі старшакласнікі СШ № 2 і дзеці-інваліды з Верхнядзвінскага тэрытарыяльнага цэнтра дзённага прыбывання.

Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк

1 кастрычніка Літаратурна-музычная гасцёўня “В листопаде октября” (*Замастоцкая сельская бібліятэка, ДШМ*).

22 кастрыніка Сустрэча з дзіцячым пісьменнікам *Валерыем Квілорыя* (*Акцябрская сельская бібліятэка*).

26 кастрычніка Да 70-годдзя з дня вызвалення гарадскога пасёлка ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: выстаўка-панарама “Мой родны край – мая Суражчына”, прэзентацыя бібліяграфічнага дапаможніка “И помнит мир спасенный”, экспрэс-агляд “Людзьмі і памяццю жыве мой край”, літаратурна-музычная сустрэча “Памяць сэрца” з удзелам мясцовых паэтаў і творчай інтэлігенцыі (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк

2 кастрычніка Вечарына-сустрэча з удзелам адзінокіх састарэлых людзей, інвалідаў, якія пражываюць у Доме ветэранаў “Славим мудрость и молодость души” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

23 кастрычніка Сустрэча з дзіцячым пісьменнікам *В. Т. Квілорыя* (*дзіцячая бібліятэка*).

24 кастрычніка Тэматычны выязны семінар бібліятэчных работнікаў раёна “Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк як сродак

супрацоўніцтва. Афіцыйная цырымонія ўзнагароджання адбылася **2 кастрычніка** ў г. Любліне (Польшча). Полацкі раён прызнаны лепшым у намінацыі “Турызм”.

http://www.pvestnik.by/?p=14805

З **4** па **7 кастрычніка** ў рамках праекта “Белла-Двина-2” адбыўся прама-тур для вядучых тураператараў Масквы і Санкт-Пецярбурга з удзелам расійскіх СМІ. Рэкламны тур быў арганізаваны ўпраўленнем спорта і турызма аблвыканкама сумесна з полацкім агенцтвам “Семь дорог” і віцебскім ААТ “РайдоТур” па маршруце Браслаў–Віцебск–Верхнядзвінск–Міёры–Полацк–Расоны.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 8 окт. – С. 1–2.

Турыстычнай фірмай “Илва” пры падтрымцы ўпраўлення спорта і турызма аблвыканкама ў **кастрычніку** праведзены рэкламны тур для вядучых тураператараў Расіі. Прадстаўнікі кампаній з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Уладзіміра, Волагды, Яраслаўля, Сочы, Краснадара, Архангельска, іншых расійскіх гарадоў, а таксама латвійскай сталіцы Рыгі знаёміліся з турыстычнай інфраструктурай Віцебска і Полацка.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 19 окт. – С. 8.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА.

У Чашніках прайшоў раённы семінар па захаванні і развіцці народных абрадаў і традыцый. У ім прынялі ўдзел супрацоўнікі сельскіх Дамоў культуры.

Витебские вести. – 2013. – 26 окт. – С. 16.

Свята вёсак Котава і Астрэйкава Віцебскага раёна адзначалі жыхары ў **кастрычніку**, а падарылі яго сяльчанам работнікі Вымнянскага СДК і бібліятэкі.

Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2013. – 15 кастр. – С. 2.

1 кастрычніка адзначаўся **Дзень пажылых людзей**. Традыцыйным стала правядзенне ў культустановах вобласці мерапрыемстваў з нагоды гэтага свята. 1 кастрычніка ў КЗ "Віцебск" адбыўся ўрачысты вечар і святочны канцэрт творчых калектываў ДУ "Цэнтр культуры "Віцебск". Мерапрыемствы розных форм падрыхтавалі культработнікі Міёршчыны для гэтай катэгорыі насельніцтва: агеньчыкі "Залаты ўзрост" (*Туркоўскі СДК*), "А годы летят…" (*Перабродскі СДК*), "Пажылы чалавек жыве побач" (*Дзісненскі ГЦК*). вечары-сустрэчы "Как молоды мы были…" (*Міерскі РДК*), "Нам года – не беда" (*Цвецінскі СДК, Цвецінскі СДФ*), клубныя вячоркі "Нам года – не беда" (*Волкаўшчынская сельская бібліятэка-клуб*), "Мои года – мое богатство" (*Істаўскі СК*), "Почетна седина" (*Нікалаеўскі СДК*) і інш. Напярэдадні Дня пажылых людзей у Верхнядзвінску адбыўся фестываль песні "Осенний грамофон", арганізатарамі якога выступілі раённы Савет ветэранаў, раённы дом культуры і народны клуб "Ветэран". Са сцэны гучалі песні, юмарэскі, прыпеўкі ў выкананні прадстаўнікоў ветэранскіх арганізацый Верхнядзвіншчыны. Клубнымі работнікамі Талачынскага раёна да свята былі падрыхтаваны і праведзены наступныя мерапрыемствы: канцэрт-віншаванне "Ад усёй душы" (*Валосаўскі СК*), віншаванні на даму "Свет осени золотой" (*Навасельскі СК*), сустрэча за круглым сталом "Отдохнуть настало время" (*Высокагарадзецкі СК*), вечар-сустрэча "Книга жизни неповторима" (Варанцэвіцкі СДК) і інш. У сацыяльным прытулку Коханаўскай бальніцы калектывамі аматарскай творчасці Коханаўскага ГПДК праведзены канцэрт "З песняй па жыцці", а харавым калектывам народнага клуба "Ветэран" Талачынскага ГДК – канцэрт "Золотой возраст". У Полацкім раённым Доме культуры прайшло свята "Золотая осень жизни". У культурна-дзелавым цэнтры "Першамайскі" г. Віцебска адбыўся "День достойного человека", галоўнымі героямі якога сталі пенсіянеры мікрараёна. На мерапрыемстве былі прадстаўлены майстар-класы па фларыстыцы, дэкаратыўна-прыкладной творчасці, прадаваліся вырабы, зробленыя рукамі інвалідаў, якія наведваюць аддзяленне

"Профессия – гордость моя" (*цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага*).

Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк

17 кастрычніка Семінар бібліятэчных работнікаў раёна на тэму "Роля інавацыйных падыходаў у павышэнні якасці бібліятэчнай дзейнасці". У рабоце семінара прыняла ўдзел начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Браслаўскага райвыканкама *Н. В. Спірыдонава* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

З **15** па **18 кастрычніка** Тыдзень беларускай перыёдыкі, які складаўся з наступных мерапрыемстваў: газетна-часопісная выстаўка "Перыядычныя выданні: цікавыя і карысныя", забаўляльна-пазнавальная праграма "Страна "Журналия", экспрэс-агляд "Сёння на старонках газеты "Зорька" (*Відзаўская дзіцячая бібліятэка*).

З **15** па **20 кастрычніка** Тыдзень шчырых зносін, у рамках якога адбыліся наступныя мерапрыемствы: выстаўка рэпрадукцый карцін "Быть матерью – завидней доли нет", хвілінка інфармацыі "Дзень маці: з гісторыі свята", акцыя "Скажи доброе слово маме", прагляд відэароліка "Мая мама лепшая на свеце", літаратурна-музычная гасцёўня "Любовь матери сильнее смерти" (*Слабодкаўская сельская бібліятэка*).

31 кастрычніка Літаратурна-музычная кампазіцыя "До ста лет без старости" (*Барунская сельская бібліятэка)*

Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк

1 кастрыніка Тэматычны вечар да Дня пажылых людзей "Днем мудрости зовется этот день" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

11 кастрычніка Літаратурны вечар-партрэт *В. І. Рудога*. На мерапрыемстве прысутнічалі пісьменнікі *Г. Пашкоў, Т. Краснова-Гусачэнка, В. Шырко, А. Дадалка, П. Саковіч* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

14 кастрычніка Літаратурна-музычная кампазіцыя "Дазволь,

24 кастрычніка Творчая сустрэча са знакамітым беларускім паэтам, публіцыстам, крытыкам, перакладчыкам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларускай ССР імя Янкі Купалы (1980 г.) Г. М. Бураўкіным.

Выдадзены бібліяграфічны паказальнік “Жыццё эпохі: Аанатоль Багатыроў (1913–2003)” (складальнік Н. А. Пугачова), а таксама каталог “Іван Сталяроў: ля вытокаў Віцебскай школы акварэлі” (укладальнікі В. А. Дарафеева, М. Л. Цыбульскі).

Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк

14 кастрычніка Сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Расіі, паэтам *М. А. Траццяковым* (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

14 кастрычніка Літаратурна-музычная вечарына “О, вера наших матерей” з удзелам паэтак *В. Савянок*, *В. Шырынавай*, *А. Уласавай*, *В. Зенчанка* і членаў гурта “Ліра” *У. Голубева* і *Л. Лабуновай* (*бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай*).

Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

З **1** па **14 кастрычніка** Дабрачынная акцыя па зборы сродкаў для прытулку бяздомных жывёл “Шанс” (*гарпасялковая бібліятэка г. п. Баравуха*).

3 кастрычніка Тэматычная вечарына для адзінокіх людзей сталага ўзросту “Текут года, как в книге строки” (*бібліятэка імя К. Сіманава*). У мерапрыемстве прынялі ўдзел урач паліклінікі № 1 *Г. Мінаева*, *айцец Георгій* і супрацоўнік цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва *І. Дзмітрыева*.

11 кастрычніка Сустрэча “Права и обязанности” для вучняў старэйшых класаў са старшым інспектарам аддзела па справах непаўналетніх *А. Р. Бабулем*.

17 кастрычніка Прафесійны конкурс маладых бібліятэкараў

дзённага прыбывання ТЦСАНа, а таксама фотавыстаўка пад назвай “Достойное время”, прысвечаная людзям пенсійнага ўзросту.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

Витебские вести. – 2013. – 12 окт. – С. 5.

Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2013. – 1 кастр. – С. 2

Полацкі веснік. – 2013. – 8 кастр. – С. 7.

У пачатку **кастрычніка** фальклорны гурт “Язынка” Язненскага СДК прыняў удзел у восеньскім сельскагаспадарчым кірмашы “Шчодрая восень-2013” у г. Мінску.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

10 кастрычніка ў абласным Палацы дзяцей і моладзі адбыўся рэгіянальны этап рэспубліканскага конкурсу гульнёвых праектаў “Играют дети – играем мы”. Удзел прымалі каманды з Чашнікскага, Сенненскага, Расонскага, Талачынскага раёнаў, Наваполацка, Першамайскага і Кастрычніцкага раёнаў Віцебска (8 дзіцячых і 2 дарослыя), якія прадставілі інтэрактыўныя гульнёвыя методыкі.

Витебские вести. – 2013. – 12 окт. – С. 6.

10 кастрычніка адзначылі 510-годдзе жыхары год г. п. Асвея Верхнядзвінскага раёна. Удзельнікамі святочнай праграмы сталі вакальная група “Вясёлы настрой” і вучні Асвейскай дзіцячай школы мастацтваў.

Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2013. – 11 кастр. – С. 2

12 кастрычніка творчымі работнікамі Талачынскага ГДК праведзена народнае гулянне “Восеньскі кірмаш”. У праграме: канцэрт калектываў аматарскай творчасці ГДК, Звяняцкага СДК; агляд-конкурс падвор'яў сельсаветаў з удзелам калектываў аматарскай творчасці Славенскага СК, Слаўнаўскага СДК, Райцаўскага СДК, Коханаўскага ГПДК, Варанцэвіцкага СДК, Валосаўскага СК, Азерацкага СДК, Дзімітраўскага СДК, Аболецкага ДФ, Серкавіцкага СДК, супрацоўнікаў раённага Дома рамёстваў.

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

12 кастрычніка ў канцэртнай зале “Віцебск” адбыўся творчы вечар сцэнарыста, рэжысёра, акцёра і свяшчэнніка *Івана Ахлабысціна*.

Супрацоўнікі Акцябрскага Дома культуры напярэдадні свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы правялі фальклорнае свята ўшанавання мясцовай крыніцы “МаРа”.

Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2013. – 19 кастр. – С. 5.

Шырока адзначалася ў вобласці і прафесійнае свята – **Дзень работнікаў культуры**. У шматлікіх установах культуры прайшлі ўрачыстыя сходы, на якіх былі ўшанаваны ветэраны галіны, падведзены вынікі прафесіянальнага конкурсу, вызначаны лепшыя па прафесіі. У Міёрскім раёне дыпломы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі атрымалі: у намінацыі “Лепшы клубны работнік” дырэктар Язненскага СДК *Л. Г. Бервячонак*, “Лепшы бібліятэчны работнік” бібліятэкар з вёскі Дворнае Сяло *З. В. Бунта*, “Лепшы выкладчык дзіцячай школы мастацтваў” *Н. Э. Даргель*, “Лепшы майстар традыцыйных рамёстваў” кіраўнік клуба народных майстроў “Святліца” *А. Э. Батарчук*, “Лепшы арганізатар платных паслуг” дырэктар Узмёнскага СДК *Ф. А. Рогач*. Ганаровымі граматамі райвыканкама адзначаны дырэктар Дзісенскага Дома рамёстваў *А. Ф. Балаш* і загадчыца аддзела абслугоўвання і інфарматызацыі раённай бібліятэкі *Н. Ю. Калеснік*. У Зубрэвіцкім сельскім Доме культуры Аршанскага раёна адбылася сустрэча ветэранаў-культработнікаў з вёсак Вусце, Тумінічы, Лісуны, Ларынаўка, г. Оршы і г. п. Балбасава. Народны ансамбль “Дубраўка” дарыў гасцям свае песні.

Галоўнай падзеяй Тыдня маці ў Віцебскай вобласці стала ўручэнне абласной прэміі імя Героя Савецкага Саюза Зінаіды Тусналобавай-Марчанка. Урачыстая цырымонія па традыцыі прайшла 14 кастрычніка. Ушанаванне жанчын напярэдадні **Дня маці** адбылося ва ўсіх раёнах і гарадах вобласці. Спецыяльныя канцэртныя і літаратурныя праграмы падрыхтавалі ўстановы культуры рэгіёна. Святочны канцэрт “Няхай заўжды будзе мама” прайшоў на сцэне Гарадоцкага ГЦК. У фае

28 кастрычніка ў аграгарадку Язна праходзіў 4-ы фестываль праваслаўных нядзельных школ “Язненскі Благавест”, які быў прысвечаны сёлета 1025-годдзю Хрышчэння Русі. Пасля малебну ў Спаса-Праабражэнскай царкве галоўнае дзеянне фестывалю перамясцілася ў глядзельную залу СДК, дзе ацэньваліся сцэнічныя выступленні і стравы праваслаўнай кухні.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

9 кастрычніка праведзены Савет аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лепельскага райвыканкама “Аб рабоце перасовачных устаноў культуры: аўтаклуба, бібліобуса ў сістэме абслугоўвання аддаленых і маланаселеных вёсак: праблемы і перспектывы”.

Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна

4 кастрычніка ў рамках правядзення IX Міжнароднай школы якасці ў бібліятэцы адбыўся круглы стол “Практика библиотек России и Беларуси в области качества информационно-библиотечного обслуживания”, у рабоце якога прынялі ўдзел бібліятэчныя спецыялісты Расіі і Беларусі.

9 кастрычніка Адкрылася фотавыстаўка праекта “Беларусь без сирот”, прысвечаная выхаванцам ДУА “Дзіцячы дом г. Віцебска”. 9 кастрычніка ў СШ № 34 прайшла сустрэча супрацоўнікаў абласной бібліятэкі з адміністрацыяй і калектывам школы.

У рамках рэалізацыі праекта “LeWiS” дырэктарам ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна” А. І. Сёмкіным і дырэктарам СШ № 34 М. М. Лапіцкім быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве і ажыццёўлена ўрачыстая перадача “Кніжнага чамаданчыка”.

(кіраўнік Д. А. Усок);

– народны камерны аркестр УА “Віцебскі дзяржаўны музычны каледж імя І. Салярціскага” (кіраўнік А. П. Бяляўскі);

– народны тэатр сатыры і гумару “Фонограф” Гарадоцкага ГДК (кіраўнік В. М. Люкшына);

– узорны харэаграфічны калектыў “Каханачка” Коханаўскай ДШМ Талачынскага раёна (кіраўнік Н. П. Юшкевіч);

– узорная цыркавая студыя “Феерия” ДК Чыгуначнікаў г. Оршы (кіраўнік Я. С. Жваненка);

– заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль класічнага танца “Піруэт“ УК “Школа мастацтваў № 1 г. Віцебска” (кіраўнік І. В. Пчолкіна);

– народная вакальная група “Вдохновение” выкладчыкаў Ушацкай ДШМ (кіраўнік Ж. В. Савіцкая);

– народная студыя эстрадных шоу-праграм “Онлайн” ДК ААТ “Нафтан” г. Наваполацка (кіраўнік А. М. Митрошкін);

– узорная цыркавая студыя “Каскад” Пастаўскага РДК (кіраўнік А. З. Дзіль);

– ансамбль барабашчыц “Віват” Глыбоцкага ГДК (кіраўнік М. А. Цветнікава).

Віцебскі АМЦНТ

18 кастрычніка ў Чапукоўскім СДК Міёрскага раёна адбылося раённае сямейнае свята “Гаспадар зямлі”. Восем сямей спаборнічалі ў розных выпрабаваннях. Першае месца прысуджана *Алегу* і *Але Байчукам*.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

19 кастрычніка ў дэндрапарку ДЛГУ “Верхнядзінскі лясгас” прайшоў фестываль лясных ідэй “Дендро-2013”. У праграме: выстаўка-конкурс арыгінальных лавак, продаж мёду, пасадачнага матэрыялу, а таксама канцэрт калектываў РДК “Песни осени”, экспазіцыя работ з прыроднага матэрыялу, выстаўка літаратуры экалагічнага накірунку.

Витебские вести. – 2013. – 12 окт. – С. 14

Дома культуры разгарнулася выстаўка дзіцячых малюнкаў “Нашым мамачкам прысвячаецца” выхаванцаў мастацкага аддзялення школы мастацтваў, прыцягвалі ўвагу вырабы ўдзельнікаў народнага клуба народных майстроў “Вытокі” Дома рамёстваў і фальклора, кніжная выстаўка “Мама, мамачка, матуля”, арганізаваная супрацоўнікамі Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэкі. **14 кастрычніка** ў Шумілінскім РДК адбылася тэатралізаваная канцэртная праграма “Мама, мілая мама!”. У час свята былі падведзены вынікі раённага конкурсу “Мая зямля – мой родны дом”. Канцэртную праграму падрыхтавалі работнікі культуры і самадзейныя артысты. На працягу месяца работнікамі клубных устаноў Талачынскага раёна да Дня маці былі падрыхтаваны і праведзены наступныя мерапрыемствы: агеньчык “О, как прекрасно это слово – мама” (*Высокагарадзецкі СК*), конкурс дзіцячага малюнка “Под звездой Матери” (*Навасельскі СК*), канцэрт “Поздравляем милых мам” (*Навасельскі СК*), тэматычны вечар “Милая мама” (*Райцаўскі СДК*), канцэрт “Самая лучшая мама на свете” (*Серкавіцкі СДК*) і інш. У Міёрскім раёне шэраг канцэртаў з пяшчотнымі і ласкавымі назвамі адгучаў для дарагіх і любімых матуль: “Зазірніце ў матуліны вочы!” (*Дзісненскі ГЦК*), “Матуля, мілая мая!” (*Узменскі СДК*), “Самым любімым” (*Цвецінскі СДК*), “Пад матулінай зоркай” (*Перабродскі СДК*), “Люблю цябе бясконца!” (*Сіцькоўскі СДК*), “Пра цябе спяваю, мая матуля!” (*Папшулёўскі СК*), “Матулечка мая, любімая!” (*Туркоўскі СДК*); агеньчыкі “Усміхніся, дарагая!”, “Это светлое слово – Мать!” (*Істаўскі СК*), “Няма за матулю даражэй!” (*Дзісненскі ГЦК*); клубныя вячоркі “Мама, твое имя я несу по жизни, как святыню” (*Лявонпальскі СЦКД*), “Мамина пластинка” (*Узменскі СДК*) і інш.

Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

Герой працы (Шуміліна). – 2013. – 18 кастр. – С. 4

19 кастрычніка ў культурна-забаўляльным цэнтры “Планета” прайшоў першы адбор удзельніц конкурсу “Мисс Витебск-2013”. Другі тур кастынгу адбыўся **27 кастрычніка** ў Віцебскім дзяржаўным

тэхналагічным ўніверсітэце.

Витебские вести. – 2013. – 17 окт. – С. 23.

20 кастрычніка ў канцэртнай зале “Віцебск” адбыўся канцэрт “Из истоков фламенко” ў выкананні акцёраў тэатра «Paya’s» (Іспанія)

http://www.gck.by/category/news/

22 кастрычніка ў Талачынскім ГДК прайшоў раённы семінар “Основы клубоведения” для кіраўнікоў клубных устаноў, якія не маюць спецыяльнай адукацыі.

РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна

24 кастрычніка ў выставачнай зале “Духовскі круглік” ДУ “Цэнтр культуры “Віцебск” адбылася сустрэча з віцебскім мастаком, выкладчыкам Цэнтра эстэтычнага выхавання “Маладзік” *Ігарам Дуравым* “Образ города в пространстве и времени. XIV век”.

http://www.gck.by/

25 кастрычніка ў Дубровенскім РДК адбылося свята, прысвечанае 60-годдзю раённай дзіцячай бібліятэкі. Сваю творчасць дарылі ўдзельнікам урачыстасці вучні школ горада і супрацоўнікі РДК.

Дняпроўская праўда (Дуброўна). – 2013. – 2 лістап. – С. 1.

27 кастрычніка ў культурна-гістарычным комплексе “Залатое кальцо Віцебска “Дзвіна” адбылася першая сустрэча ўдзельнікаў праекта асветніцкіх сустрэч-семінараў для маладых бацькоў “Забаўлянкі для Янкі”.

Витебские вести. – 2013. – 2 нояб. – С. 16.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

5 кастрычніка ў аграгарадку Буда Дубровенскага раёна прайшло раённае свята “Ах, бульбачка!”. Яго арганізатары – работнікі Будскага СДК, аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама і раённы арганізацыйна-метадычны цэнтр. У мерапрыемстве прыняла ўдзел вакальная група “Белорусочка” Асінторфскага СДК.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2013. – 12 окт. – С. 1–2.

9 кастрычніка ў абласной філармоніі адбыўся фінальны канцэрт «Пусть зажигаются звезды…» пераможцаў тэлевізійнага творчага праекта “Зорны шлях”, які правадзіўся сумесна з тэлекампаніяй “СКИФ”. Пераможцамі творчага праекта сталі наступныя калектывы і выканаўцы:

– народная студыя сучаснага танца УА “Віцебскі каледж культуры і мастацтваў» (кіраўнік І. В. Бухавецкая);

– заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь фальклорны ансамбль “Паазер’е” выкладчыкаў Пастаўскай ДШМ (кіраўнік А. А. Собаль);

– узорны фальклорны калектыў “Нежачкі” Расонскага цэнтра дзяцей і моладзі (кіраўнік А. М. Вашчанка);

– народны ансамбль старажытнай музыкі “Виолино” выкладчыкаў Ветрынскай ДШМ Полацкага раёна (кіраўнік І. Л. Хадзякова);

– узорны ансамбль флейтыстаў “Сиринкс” УА “Аршанская дзяржаўная агульнаадукацыйная СШ № 8” (кіраўнік Н. В. Жалезнякова);

– зорны харэаграфічны калектыў “Лялькі” Верхнядзвінскага РДК (кіраўнік Л. С. Гуйда);

– тэатр песні “Маленькая фея” Шаркаўшчынскага РДК (кіраўнік В. М. Шуман);

– народная эстрадная вакальная студыя “Музыкальная волна” Полацкага ГДК (саліст Л. А. Кехваян);

– народная эстрадная студыя “Серпантин” УА “Полацкі каледж Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава” (саліст А. А. Анісімаў);

– узорная музычная студыя “Альтанка” ГП “ЖРЭТ” Першамайскага раёна г. Віцебска (кіраўнік М. М. Радзівонаў);

– народны тэатр фальклору “Цярэшка” Глыбоцкага РМЦ (кіраўнік Н. В. Нікіфаровіч);

– народная эстрадная студыя “Калейдоскоп” Докшыцкага ГЦК